# НАША АГУЛЬНАЯ СПРАВА

А. БУРАЎСКІ, сакратар парткома.

Рашэнні лютаўскага (1964 г.) Пленума ЦК КПСС аб інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці — важнейшы этап у барацьбе савецкага народа за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, стварэнне багацця сельскагаспадарчых прадуктаў у краіне. Кожны савецкі чалавек можа і павінен унесці свой пасільны ўклад у гэтую ўсенародную справу. Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі і кафедры ўніверсітэта павінны ўзмацніць работу па растлумачэнню рашэнняў лютаўскага Пленума, даклада таварыша М. С. Хрушчова на нарадзе кіруючых работнікаў партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў 28 лютага г. г., а таксама матэрыялаў сакавіцкага Пленума ЦК КПБ.

Нам неабходна дасягнуць, каб кожны студэнт і супрацоўнік універсітэта вывучыў і асэнсаваў гэтыя важнейшыя дакументы і зрабіў для сябе практычныя вывады. Акрамя самастойнай работы, тут трэба выкарыстаць гутаркі, палітычныя інфармацыі, заняткі ў сетцы партыйнай асветы, лекцыі і даклады і інш. Тут вялікую ролю прызваны адыграць куратары, навуковыя супрацоўнікі, аддзяленне таварыства «Веды», наш партыйны, камсамольскі і прафсаюзны актыў.

Партыйныя арганізацыі сумесна з дэканатамі павінны абмеркаваць і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу студэнтаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў у рабоце па выкананню рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК КПСС і сакавіцкага Пленума ЦК КПБ узмацніць дапамогу падшэфным калгасам і саўгасам. У нас, у БДУ, паспяхова працуюць сотні навуковых работнікаў: матэматыкаў, фізікаў, хімікаў, біёлагаў, эканамістаў, філосафаў, гісторыкаў, географаў і інш. Ёсць вялікая неабходнасць, каб на кожнай кафедры былі абмеркаваны матэрыялы Пленумаў ЦК КПСС і ЦК КПБ і намечаны меры, якія забяспечылі б удзел кожнага вучонага ў масава-палітычнай і навукова-даследчай рабоце, што садзейнічала б ажыццяўленню намечаных партыяй задач. Гэта перш за ўсё датычыцца да нашых вучоных — біёлагаў, глебазнаўцаў, хімікаў, географаў. У гэтай сувязі на партарганізацыі і дэканаты і кафедры адпаведных факультэтаў ускладаецца асабліва ганаровая і адказная задача.

З мэтаю ўзмацнення прапаганды рашэнняў снежаньскага (1963 г.) і лютаўскага Пленумаў ЦК КПСС партыйныя арганізацыі павінны паклапаціцца, каб на факультэтах, у ленпакоях інтэрнатаў, у кабінетах грамадскіх навук былі падрыхтаваны стэнды, фотавітрыны, фотамантажы і інш. Паказаць прыклад у гэтай справе павінны кабінеты грамадскіх навук і бібліятэка універсітэта. Прапаганда і ажыццяўленне рашэнняў снежаньскага і лютаўскага Пленумаў ЦК КПСС — гэта не кампанейская, а пастаянная, настойлівая, умелая, шматгранная работа партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый нашага ўніверсітэта.

# Перспектывы абавязваюць

Багатым, паўнакроўным жыццём жыве зараз кожны факультэт. Усё больш цікавай і разнастайнай становіцца навукова-даследчая работа, удасканальваецца вучэбна-выхаваўчы працэс. І ў гэтых цудоўных справах тон задаюць камуністы, камсамольцы.

Але ці не абмяжоўваем мы часам штучна інтарэсы людзей толькі праблемамі факультэта? Над гэтым пытаннем задумаліся члены партбюро гістфака. Тут рашылі часцей выносіць на абмеркаванне камуністаў і беспартыйных агульныя, найбольш актуальныя праблемы камуністычнага будаўніцтва. Першы жа такі сход паказаў, што рашэнне прынята правільнае.

Камуністы гістфака абмеркавалі пытанне аб перспектывах развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі. З дакладам выступіў Старшыня Дзяржплана БССР С. М. Малінін. Ужо тое, што даклад даў шмат арыгінальнага фактычнага матэрыялу, адыграла вельмі вялікую ролю. Удзельнікі сходу прама заявілі, што факты і лічбы яны будуць выкарыстоўваць у лекцыях, у прапагандысцкай і агітацыйнай рабоце сярод насельніцтва. Выказалася пажаданне часцей наладжваць такія сустрэчы з кіруючымі работнікамі рэспублікі. Карысць несумненная.

Нам хацелася б звярнуць увагу на іншы бок справы. Сходы з такім парадкам дня яшчэ больш вучаць камуністаў жыць інтарэсамі рэспублікі, краіны, думаць пра перспектывы свайго факультэта, пра яго месца ў агульным страі савецкага народа.

Характэрным у гэтых адносінах было выступленне загадчыка кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесара І. М. Лушчыцкага. З вялікай заклапочанасцю ён гаварыў, што падрыхтоўка спецыялістаў па філасофскіх дысцыплінах у рэспубліцы яўна адстае ад патрабаванняў жыцця, не гаворачы ўжо пра перспектывы, якія адкрываюцца перад рэспублікай у справе развіцця народнай адукацыі і асветы. Цяпер у вну, тэхнікумах, школах уведзены і ўводзяцца новыя дысцыпліны: асновы навуковага камунізма, асновы навуковага атэізму, грамадстваўнаўства і інш. А кваліфікаваных кадраў не хапае. І тут паўстае неабходнасць аднавіць у БДУ філасофскае аддзяленне. У свой час такое аддзяленне (яно было закрыта ў 1955 годзе) адыграла пэўную ролю ў ідэйным жыцці Беларусі. Пераважная большасць выпускнікоў аддзялення працуе цяпер у вну, тэхнікумах, многія абаранілі кандыдацкія дысертацыі, сталі цудоўнымі выхавацелямі.

Пытанне аб аднаўленні аддзялення ўжо некалькі гадоў ставіцца. Яго неабходна рашаць, і чым хутчэй, тым лепш. Гэта таксама забяспечыць набор у аспірантуру найбольш падрыхтаваных таварышаў.

Зразумела трывога, з якой гаварыў пра падрыхтоўку навуковых кадраў загадчык кафедры гісторыі КПСС У. М. Сікорскі. У аспірантуры вельмі мала месц. Чамусьці дагэтуль недаацэньваецца сістэма завочнага навучання ў аспірантуры. І вось атрымоўваецца, што сёлета па гісторыі КПСС аспірантуру заканчвае ўсяго адзін чалавек. А толькі ж нашай кафедры патрабуецца пяць супрацоўнікаў.

Перспектывы абавязваюць, заявіў на сходзе дэкан факультэта П. З. Савачкін, не толькі павялічыць прыём аспірантаў, але і стварыць новыя кафедры (дапаможных дысцыплін, гісторыі паўднёвых і заходніх славян), паглыбіць спецыялізацыю. Цяпер рыхтуецца група маладых гісторыкаў, якія будуць выкладаць свой прадмет у школах, дзе навучанне вядзецца на замежных мовах. Неабходна правесці работу, каб спецыялізаваць студэнтаў па асновах навуковага камунізма, гісторыі КПСС, па атэізму і г. д.

Прафесар Н. Е. Рагозін, студэнт 4 курса В. Радзецкі і іншыя ўзнялі пытанне аб тэматыцы навуковых даследаванняў, аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў. Але ў галоўным выступленні зводзіліся да аднаго — перспектывы развіцця эканомікі і культуры рэспублікі абавязваюць факультэт многаму. Ён таксама павінен паскорыць крок. І тут, як паказаў сход, не абыйсціся без дапамогі Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР, Дзяржплана БССР і іншых рэспубліканскіх органаў. Відаць, дэканату і партыйнаму бюро трэба праяўляць большую настойлівасць у рашэнні пытанняў, якія маюць значэнне не толькі для факультэта, але і для рэспублікі.

М. РЭГІСТАНАЎ.

*Абмяркоўваем артыкул „Хата прыгожая і вугламі"*

# МЫ ТАКСАМА СТВАРАЛЬНІКІ ТРАДЫЦЫЙ

Вельмі слушную размову пачала наша шматтыражка пра падтрыманне і развіццё студэнцкіх традыцый. Чытачы з увагай сочаць за абмеркаваннем артыкула Б. А. Мельцэра. І гэта зразумела. Бо не «канфлікт пакаленняў», ад пачатку да канца надуманы недругамі нашай моладзі, а пераймание ўсяго лепшага са спадчыны бацькоў і дзядоў, напаўненне новым, адпавядаючым часу зместам добра зарэкамендаваўшых сябе форм працы, вучобы і адпачынку, прадоўжанне баявых рэвалюцыйных і працоўных традыцый, пераймание эстафеты старэйшых характэрны для спраў і настрою моладзі 60-х гадоў «веку камунізма».

Шмат слаўных спраў на ліку калектыву нашага ўніверсітэта — адной са старэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Кожнаму зразумела, якім багатым скарбам для выхавання моладзі, сучаснага студэнцтва была б гісторыя ўніверсітэта. Паглядзіце, з якім хваляваннем юнакі і дзяўчаты спыняюцца ля арганізаванай парткомам выстаўкі «Выкладчыкі ўніверсітэта — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны»! Філолагі з цікавасцю разглядаюць фотаздымак сваёй выкладчыцы С. А. Лысенка ў салдацкай форме. Я сам бачыў, як тоўпіліся хімікі ля партрэта свайго выкладчыка Г. С. Маханька. Пэўна, некаторыя ўпершыню даведаліся, што выкладчык гісторыі КПСС Д. П. Жмуроўскі — Герой Савецкага Саюза. А ўспомніце, якую цікавасць выклікала ў свой час юбілейная выстаўка «40 гадоў універсітэту»!

Ці варта даказваць увесь ідэйны, выхаваўчы сэнс такіх спраў! І шкада, што ва ўніверсітэце, дзе маюцца моцны гістарычны факультэт, аддзяленне журналістыкі, да гэтага часу не створана гісторыя ўніверсітэта. На маю думку, гэта была б вельмі патрэбная скарбніца лепшых традыцый вялікага калектыву. Многія вну рэспублікі ўжо рыхтуюць такія даследаванні. Адставанне ў гэтай справе не робіць гонару ўніверсітэту. Трэба сказаць пра вельмі карысную справу, якую робіць загадчык кафедры гісторыі БССР Л. С. Абецадарскі. Ён ужо некалькі гадоў карпатліва збірае матэрыялы па гісторыі ўніверсітэта і гістарычнага факультэта. Вялікую цікавасць уяўляюць знятыя Абецадарскім кароткаметражныя фільмы аб жыцці факультэта.

Але ўсё гэта робіцца пакуль што намаганнямі нямногіх. Патрэбна ўвага рэктарата і грамадскіх арганізацый БДУ, каб даць гэтай справе належны ход.

Відавочна, музей меў бы вялікае значэнне для выхаваўчай работы. Там можна было б размясціць шматлікія экспанаты з гісторыі БДУ, якія расказвалі б пра яго лепшых людзей, іх працу і жыццёвыя шляхі, пра сувязі з іншымі вну краіны. А цяпер, калі ў нас навучаюцца студэнты з 14 краін, музей набыў бы і сваё «міжнароднае» значэнне. Я перакананы, што такі музей будзе мець не менш наведвальнікаў, чым наш гістарычны. Ён стаў бы своеасаблівай залай славы, гонару, пастом нумар адзін. Між іншым, у музеі знайшлося б месца для адлюстравання працы і вучобы нашых завочнікаў і вячэрнікаў. А які гэта багаты зместам матэрыял!

Добрай традыцыяй сталі ў нас сустрэчы з выпускнікамі. Студэнты з прагнасцю слухаюць выступленні «з месц», наперабой распытваюць пра ўражанні учарашніх сваіх студэнцкіх сяброў, а зараз упаўнаважаных фронту народнай асветы, якіх малыя завуць Пятровічамі, Міхайлавічамі і г. д. Выкладчыкі таксама з ахвотаю ідуць на такія сустрэчы са сваімі выхаванцамі. Ды тут жа адбываецца тая самая «адваротная сувязь» — выпускнікі расказваюць аб тым добрым, што яны ўзялі ва ўніверсітэце, або ўскрываюць прагалы, што перашкаджаюць іх працы, выяўляюць такім чынам каэфіцыент карыснага дзеяння вучэбнага працэсу. І факультэты павінны да такіх сустрэч рыхтавацца больш адказна, чым як гэта дзе-нідзе бывае. Гэта павінна быць справаздачай камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый аб сваёй працы, аб тым, як прадаўжаюцца і папаўняюцца традыцыі факультэта, памнажаюцца карысныя справы. І рытуал тут павінен быць арыгінальны, хвалюючы.

Вось некаторыя думкі, якімі я хацеў падзяліцца наконт падтрымання і развіцця ў нашым універсітэце добрых традыцый. Не сумняваюся, што гутарка на гэтую тэму будзе працягвацца і далей. Аднachасова хачу парэкамендаваць камітэтам камсамола факультэтаў правесці абмеркаванне артыкула Б. А. Мельцэра на сходах у акадэмічных групах.

І. СЯРГЕЕЎ, аспірант.

### У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ

*Партыйны камітэт універсітэта рашыў арганізаваць сумесна з камітэтам камсамола, камітэтам дружбы і рэдакцыяй газеты «Беларускі ўніверсітэт» літаратурны конкурс на лепшы нарыс, апавяданне, фотанарыс, верш, замалёўку, прысвечаныя жыццю і вучобе студэнтаў-іншаземцаў. Конкурс будзе праводзіцца штогод.*

* * *

*Для развіцця літаратурнай творчасці сярод членаў універсітэцкага калектыву партыйны камітэт БДУ рашыў стварыць пры рэдакцыі шматтыражнай газеты «Беларускі ўніверсітэт» літаратурнае аб'яднанне.*

# ЗА МАСАВЫ СПОРТ

Адбылася справаздачна-выбарчая канферэнцыя спартыўнага клуба БДУ. Старшыня праўлення клуба М. А. Шэйнеман расказаў пра поспехі, якіх дасягнулі спартсмены ўніверсітэта за два справаздачных гады. А іх было нямала. Сапраўды масавым відам спорту сталі шашкі, вялікіх поспехаў дасягнулі турысты. Лёгкаатлеты, баскетбалісты, валейбалісты, веласіпедысты, барцы паспяхова выступаюць на студэнцкіх спаборніцтвах. Але гэтага яўна недастаткова. Уся работа секцый абмяжоўваецца работай са зборнымі камандамі.

Слаба вядзецца прапаганда спорту, спорт не стаў у нас сапраўды масавым. Ці не пра гэта гаворыць тое, што на канферэнцыю з'явілася толькі палавіна дэлегатаў? А проста так прыйсці на канферэнцыю, паслухаць, што там гаворыцца, самому выступіць — на гэта не адважыўся ніводзін спартсмен. Ці не ў гэтым раўнадушшы хаваецца прычына таго, што многія выступаўшыя скардзіліся на адсутнасць прыцёку новых спартсменаў? Ды гэта і натуральна. Выкладчыкі кафедры фізвыхавання слаба займаліся прыцягненнем студэнтаў у секцыі. Яны, у асноўным, чакалі, калі спартсмены самі прыдуць да іх. У праўленні актыўна працавала толькі трэцяя частка яго членаў.

На жаль, канферэнцыя не выкрыла ўсіх недахопаў у рабоце спортклуба і не наметіла шляхоў іх выкаранення. Выступаўшых было мала. Крытычных выступленняў амаль зусім не было. Такое трывожнае становішча трэба выпраўляць. Можа, варта правесці канферэнцыю з удзелам усіх спартсменаў універсітэта, абмеркаваць на ёй будучае ўніверсітэцкага спорту. Для гэтага неабходна вялікая работа, дапамога партыйнай арганізацыі, рэктарата.

Кафедры фізвыхавання неабходна больш увагі ўдзяляць развіццю масавых відаў спорту. Чаму б не арганізаваць спаборніцтвы па настольнаму тэнісу, шахматах, шашках непасрэдна ў інтэрнатах, праводзіць там заняткі секцый? Для гэтага неабходна толькі набыць інвентар і выдзяліць памяшканне. Можа, гэта дорага каштуе? Не. Шашысты, напрыклад, ужо два гады просяць кафедру купіць сто камплектаў шашак. Каштуе гэта толькі пяцьдзесят рублёў. Няма ў іх ніводнай дэманстрацыйнай дошкі, гадзіннікаў і, самае галоўнае, пастаяннага памяшкання. Але і ў такіх цяжкіх умовах секцыя хутка расце. Ці задаволены гэтым на кафедры? Не зусім. А дапамагаць шашыстам тым больш не збіраюцца. Смешна, але гэта так.

Новаму праўленню спартыўнага клуба неабходна перабудаваць сваю работу. Яно павінна ўнікаць у розныя пытанні, якія дагэтуль былі манаполіяй кафедры фізвыхавання. Неабходна зрабіць упор на развіццё масавасці спорту. А дзе масавасць, там і майстэрства.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

Пісьмо ў рэдакцыю

# ВОСЬ І ВЕР ТАКОМУ РАШЭННЮ!

Антаніна Якаўлеўна Гарачава працуе камендантам інтэрната № 2. За некалькі гадоў яе кіраўніцтва ўзрасла не толькі працоўная дысцыпліна тэхработнікаў інтэрната, але і парадак у ім. На калідорах заўсёды пануе чысціня, утульна ў ленпакоі. Антаніну Якаўлеўну можна ўбачыць і ў пакоях студэнтаў, калі яна правярае там парадак, і на пасяджэннях студсавета, рэдкалегіі насценгазеты, і проста ў час гутаркі са студэнтамі пра іх жыццё і вучобу.

У 1962 годзе ў сацспаборніцтве паміж універсітэцкімі інтэрнатамі 2-гі інтэрнат заняў другое месца. У лістападзе мінулага года былі падведзены вынікі чарговага этапа сацыялістычнага спаборніцтва. На гэты раз інтэрнат № 2 заняў першае месца. Прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы А. В. Кірсанаў неаднаразова пасылаў камендантаў з іншых інтэрнатаў павучыцца вопыту работы Антаніны Якаўлеўны Гарачавай.

У святочны дзень 8 сакавіка адбыўся сход абслугоўваючага персаналу ўніверсітэта. З урачыстай прамовай выступіў А. В. Кірсанаў. Ён павіншаваў жанчын са святам, пажадаў ім далейшых поспехаў у рабоце і ўручыў падарункі за іх плённую працу. Каштоўныя падарункі і падзякі атрымалі каменданты з інтэрната па вул. Свярдлова і вучэбнага корпуса па вул. Чырвонаармейскай, занявшых апошнія месцы ў сацыялістычным спаборніцтве. Затое інтэрнат № 2 не атрымаў нічога, нават не адзначана было імя яго каменданта А. Я. Гарачавай.

Вось і вер пасля гэтага рашэнню аб перамозе ў спаборніцтве!

Члены студсавета інтэрната № 2:
Кучынскі,
Даўжанок,
Тушынскі,
Паўловец.

Рэдактар М. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус. 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02133. Тыр. 2000. Зак. 1253.